*А.М. Мялешка, Ю.В. Мялешка*

# Музей гісторыі медыцыны суседняй Латвіі

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка*

У гэтым годзе нам пашчасціла адпачываць у суседняй Латвіі. Ад сваіх сяброў з беларускага пасольства мы пачулі аб існаванні ў цэнтры Рыгі цікавага музея гісторыі медыцыны, які адразу захацелася наведаць.

Музей гісторыі медыцыны ў Рызе носіць імя Паўла Страдыня. Ён быў створаны ў 1957 годзе. Асновай стварэння яго паслужыла асабістая калекцыя латвійскага ўрача, хірурга, гісторыка медыцыны, прафесара Паўла Страдыня (1896-1958) (мал. 1), якая збіралася больш 30 гадоў, і прафесара фармацыі Яніса Майзітэ (1883-1956). Для наведвальнікаў музей быў адчынены ў 1961 годзе. Ён уражвае сваімі маштабамі: займае 4 паверхі, улічвае паслядоўнасць стагоддзяў (менавіта так задумаў у свой час прафесар П. Страдынь) і мае мноства залаў.



Мал. 1. Фотаздымак прафесара Паўла Страдыня з брашуры музея

У яго экспазіцыі паказана гісторыя развіцця медыцыны ад старажытных часоў да нашых дзён. Яна складаецца з 4-х тэматычных раздзелаў, якія ўключаюць гісторыю зараджэння медыцыны, яе развіццё ў старажытныя, сярэднія стагоддзі, новы і навейшы час. Таму кожны наведвальнік быццам становіцца ўдзельнікам доўгага падарожжа.

Уводная частка экспазіцыі прысвечана пачатку развіцця медыцыны. У той час пісьменнасць яшчэ не з'явілася і таму галоўнай крыніцай інфармацыі з'яўляўся археалагічны матэрыял, этнаграфія і фальклор. На дыяграмах паказана перавязка ран, трапанапункцыя чэрапа, лячэнне розных цялесных пашкоджанняў, старажытныя спосабы ўрачавання. Малюнкі, карціны, макеты, кампазіцыі з васкавых фігур даюць уяўленні пра старажытныя паселішчы, эпізоды бытавога жыцця, характэрныя раненні і хваробы. У вітрынах прадстаўлены разнастайныя знойдзеныя падчас археалагічных раскопак медыцынскія прадметы, чарапы і косці з прыкметамі разнастайных хвароб.

Магічная медыцына прадстаўлена амулетамі і маскамі.

Цікава прадстаўлена медыцына сярэднявечча. Так як вядома, што першы шпіталь узнік у Рызе ў 1220 г. з прыюта пры манастыры, дзе хворых дагледжвалі манахі і манахіні. Таму менавіта так і прадстаўлена дадзеная экспазіцыя – васкавымі фігурамі хворых, манахінь і святара. Трэба адзначыць, што гэтыя васкавыя постаці вельмі ўражваюць кожнага наведвальніка музея сваім дакладным выкананнем: яны зроблены ў натуральную велічыню чалавека, маюць колер скуры, як і ў жывога чалавека, на іх бачны нават вены. Часам здавалася, што знаходзішся ў тым часе і з'яўляешся



Репозиторий БГПУ

ўдзельнікам гэтых сцэн.

Асаблівай увагі заслугоўвае, на наш позірк, сцэна барацьбы супраць эпідэміі чумы, якая падсвечвалася ў зале цмяным святлом ліхтароў, і што стварала эфект сапраўднага жаху (мал. 2). Ад гэтага хацелася хутчэй пакінуць гэтую залу, што яшчэ раз падкрэсліла высокі прафесіяналізм стварэння кампазіцыі.



Мал. 2. Сцэна барацьбы супраць чумной эпідэміі. Фота аўтараў

У адной з залаў яскрава адлюстраваны рэчы быту селяніна, якія з'яўляліся прычынамі распаўсюджання хвароб сярод простага народа. А народная медыцына таго часу прадстаўлена ў выглядзе васкавых фігур знахароў і знахарак за зборам лекавых раслін і зёлак (мал. 3).



Мал. 3. Збор лекавых раслін знахарамі. Фота аўтараў

Многія залы знаёмілі з будовай цела чалавека, яго функцыямі, хваробамі, выклікаными дрэннымі звычкамі. Яны былі аздоблены featureнымі муляжамі і мікраскопамі, у якія мог зазірнуць кожны наведвальнік, а таму стаць самастойным даследчыкам.

Музей пазнаёміў нас са шматлікім медыцынскім інструментарыем, які ўжываўся

пры розных аперацыях у розныя часы, а таксама з методыкамі іх выканання. Мы ўбачылі тут чучала вялікага двухгаловага сабакі, да карка якога пры аперацыі былі прышыты шыя і галава меншага сабакі.

З вялікай цікавасцю мы агледзелі залы з экспанатамі кас-мічных дасягненняў. Пазнаёміліся ў іх з касмічнымі апаратамі, адзеннем касманаўтаў і прадуктамі харчавання, якія бралі яны з сабою ў палёты.

Карацей кажучы, нам спадабалася ў гэтым музеі выключна ўсё. Таму ў кнізе водгукаў для наведвальнікаў 14 жніўня 2004 года намі, як прадстаўнікамі БДМУ, быў зроблены запіс з падзякай. Мы заклікаем усіх, хто калі-небудзь будзе ў Рызе, абавязкова наведаць гэты музей. Яго адрас: Рыга, Антоніяс, 1.

З усяго вышэйсказанага можна зрабіць вынік, што музей адлюстроўвае гісторыю медыцыны як галіну медыцынскай навукі, якая даследуе навуковае, практычнае яе развіццё і дзейнасць чалавека ў ёй. Таксама ён збірае новыя факты аб працэсах у медыцыне, сістэматызуе і абагульняе іх не толькі для Латвіі, але таксама для наведвальнікаў і даследчыкаў з усяго свету.

Репозиторий БГМУ